**Сауліч, У**. Вяртанне / У. Сауліч // Віцебскі рабочы. — 1988. — 29 сак. — С. 2.

**ВЯРТАННЕ**



...Наша газета расказвала ўжо чытачам пра лёс Генадзя Броўкі, маладога хлопца, былога воіна-інтэрнацыяналіста, які застаўся без нагі. Але той расказ быў незавершаным. Ён абрываўся на мары Генадзя вярнуцца на трактар. І вось сёння гэты расказ можна прадоўжыць.

Трактар пад’ехаў да шматкватэрнага панэльнага дома і прытармазіў ля аднаго з пад'ездаў. Адчыніліся дзверцы кабіны, паказаўся Генадзь. Як добрыя знаёмыя, мы павіталіся, бо сустракаліся да гэтага неаднойчы. Генадзь пачаў даставаць з кабіны розныя запчасткі і класці тут жа, ля трактара, на ўтаптаны снег.

– Атрымаў учора на заводзе трактар, – удакладніў. – І запчастак вось далі ў запас. Прывёз іх дадому, цалей будуць.

Запчастак набралася багата, цэлая горка. Разам з Генадзем і пачалі насіць іх у яго кватэру на першым паверсе.

Генадзь паклаў запчасткі прама ў прыхожай. Я паглядзеў на жонку Генадзя – Наташу, або як ён яе проста заве – Нату, як адрэагуе: чысціня, парадак, а тут мы з жалязякамі, змазанымі салідолам. Ната толькі ўсміхнулася. І па гэтай шчырай усмешцы я зразумеў**,** што яна ў Генадзя не проста жонка, але і сяброўка, якая разумее з паўслова.

Потым мы з Генадзем садзімся за стол, за кубачкам кавы і пачынаем размову, Генадзь поўны ўражанняў ад учарашняй паездкі на Мінскі трактарны завод.

– Адправіліся ў Мінск рана. Правялі нас праз прахадную. Здаецца, усё нармальна. Трактар, сказалі, гатовы. Ажно не верыцца: гэта ж больш чым паўгода чакання, з самага жніўня. І раптам высвятляецца, што наш раён ужо выбраў фонд. Вы ўяўляеце, што гэта такое?..

...Як не ўявіць? Трактар жа для Генадзя – гэта ўсё ў жыцці.

Нарадзіўся Генадзь у вёсцы з прыгожай назвай Бяседа. Там жа нарадзілася і яго мара. Яшчэ, калі бегаў хлапчуком, убачыў аднойчы каменедрабілку, якая прыводзілася ў рух трактарам. Прыглянулася работа трактарыста, запала ў душу – і ўсё тут. І хоць вучыўся добра, і ў дзевяты клас угаворвалі пайсці, а падаў дакументы ў Лепельскае прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча. А як вяртаўся з Лепеля дахаты, ішоў у поле і прасіў у трактарыстаў даць папрацаваць за штурвалам.

Часцей за ўсё давяраў яму свой вясковы трактарыст Аляксандр Пахомчык. Бывае, аж на цэлы дзень даваў такую бясплатную нелегальную падмену. А потым Генадзь у свае мясціны трапіў на практыку. Паставілі да Фёдара Аўтушкі напарнікам. Не вытрымаў, адразу ж пабег да яго, каб прыняцца за справу. Трактар стаяў каля хаты Аўтушкі, а самога гаспадара не было дома. Жонка яго катэгарычна адмовіла браць трактар без дазволу.

Давялося звярнуцца да брыгадзіра. І вось на гэтым трактары пачаў Генадзь работу ў полі ў сем гадзін раніцы, а закончыў у тры гадзіны ночы.Поле, разлічанае для апрацоўкі за тры дні, ён урабіў за суткі.

– З ахвоты гэта! Наб'е аскоміну – супакоіцца, – заўважалі некаторыя.

Але ён кожную раніцу бег са сваёй Бяседы напрасткі ў вёску Кадлубішча да трактара, і гэтай жа сцяжынкай вяртаўся ўжо прыцемкам. Фёдар Аўтушка не мог нахваліцца сваім напарнікам.

А Генадзю хацелася мець свой трактар. Хоць старэнькі, занядбаны, але свой. Знайшлі такі маленькі трактарок, Т-25, які стаяў без справы. Тым больш, што халады наступілі, а трактарок без кабіны. Пачалі вазіць тарфакрошку. Генадзь старшыні:

– Уключыце і мяне ў атрад!

– Што ж ты прывязеш? Жменьку? За дваццаць пяць кіламетраў. Толькі гаручае спаліш! – шчыра гаварылі трактарысты.

А ён – за сваё. Уступілі. Вазі, дзівак, калі няма чым заняцца. Нарасціў на прычэп барты і паехаў. Дваццаць пяць кіламетраў — дарога няблізкая. І холадна. Чуе, дапякае мароз у твар! Калі дапячэ мароз, пакладзе рукавіцы на выхлапную трубу, нагрэе, а потым гэтымі рукавіцамі да твару. Так і ездзіў. Тры разы ў дзень паспяваў вярнуцца. Дзевяць тон тарфакрошкі прывозіў. Часам больш, чым некаторыя на магутных трактарах.

– Ну і хлопец – толькі і гаварылі аб ім. – Адкуль такі ўзяўся?

– Адслужыць у арміі, вернецца, дадзім новы трактар «Беларусь», – аўтарытэтна заявіў старшыня.

Служыць Генадзь Броўка трапіў у Афганістан механікам-вадзіцелем баявой машыны пяхоты. Вось калі і дапамагла тая загартоўка: і тыя дваццаць гадзін у полі, і тыя рэйсы ў мароз на Т-25. Мінуў год службы, пайшоў другі. Усё часцей з сябрамі загаворвалі аб вяртанні дахаты.

– Прыеду дамоў, зноў пайду на трактар!

А тым часам і ліст ад родных падаспеў. А ў ім вестка, што калгас атрымлівае новы трактар «Беларусь», які будзе чакаць яго, Генадзя.

Да дэмабілізацыі заставаліся два месяцы. Быў звычайны спякотны дзень. Звычайны развод каля камендатуры. Яму з таварышамі – заступаць на баявое дзяжурства. І ў гэты момант ударыў душманскі кулямёт. Два салдаты ўпалі адразу, насмерць скошаныя варожымі кулямі. Генадзь адчуў як нешта балюча ўдарыла яму ў калена, нага падламалася. Але ён, не звяртаючы ўвагі на рану, папоўз да БМП. Ускарабкаўся на вадзіцельскае месца і вывеў машыну на пазіцыю стральбы. На ворага абрушыўся шквал агню. Бой працягваўся паўтары гадзіны...

Генадзя выцягнулі свае з БМП, калі ён ледзь не страціў прытомнасць ад страты крыві. Даставілі ў медсанбат. а потым – у Ташкент. Аперацыя. Доктар абяцае, што зробіць усё магчымае. Нага, праўда, будзе карацейшая і не будзе гнуцца.

– Нічога, што карацейшая, – супакоіў сябе Генадзь. – Крэсла ў трактары можна апусціць.

Але аперацыя не ўдалася. Потым было яшчэ чатырнаццаць аперацый, каб толькі захаваць

нагу. І зноў няўдача. Нагу прыйшлося ампутаваць. Адрэзаны шлях вяртання да мары, да сваёй любімай прафесіі.

Пасля вяртання ў родную вёску Бяседа на пратэзе пачаў рыхтаваць сябе да новых выпрабаванняў. Кіламетр пешшу за ваколіцу, на другі дзень – два. Потым – тры. Потым яшчэ, хоць кожны крок адгукаўся болем.

Каб не вісець у родных на шыі, не выклікаць спачуванняў вяскоўцаў, падаўся вучыцца на абутніка. А неўзабаве ўжо стукаў малатком у раённым камбінаце бытавога абслугоўвання. Вельмі натруджваў хворую нагу. Трапіў на месяц у бальніцу. А за гэты час, пакуль ляжаў, непрыемнасць на рабоце. Прапала дваццаць сем замкоў, і ўсё звярнулі на яго. Даказаў, што не мае адносін да прапажы замкоў-маланак. Больш таго – эканоміў.

Адзін замок разразаў на два, калі была магчымасць. Пагадзіліся, хаця прабачэння ніхто і не думаў прасіць. Не вытрымаў, сказаў майстру, што пры такіх адносінах мусіць звольніцца. І ў адказ жорсткая ўсмешка.

– Звальняйся. Каму ты патрэбен больш?

А Генадзь думаў і прыйшоў да такога заключэння: «Я езджу на машыне. Магу? Так! А чаму б не пераабсталяваць і трактар?». І пачаў самастойна думаць, як гэта лепш зрабіць.

І вось у гэты момант у рукі трапіла газета «Советская Белоруссия». А ў ёй – расказ пра Пятра Петрашкевіча, былога воіна-інтэрнацыяналіста, які таксама страціў у Афганістане нагу, але цяпер працуе на трактары! Тут жа, у газеце, і здымак Пятра з трактарам.

Гэта быў пераварот. Такога шчаслівага Генадзя ніхто не бачыў. Ён прыйшоў дахаты з высока ўзнятай у руцэ газетай:

– Ната! Чытай!

Яна чытала, а ён слухаў яшчэ і яшчэ раз і ўглядваўся ў твар хлопца з фотаздымку.

Ноч не спаў, а потым пачаў дзейнічаць. Хадзіў усюды з газетай у руках. Трэба сказаць, яго зразумелі. І ў першую чаргу – у райкоме камсамола. На Мінскі трактарны завод пайшоў заказ на спецыяльны трактар. Але не ведаў Генадзь у той час, які гэта цяжкі шлях, што міне ледзь не год, пакуль ён сядзе на трактар.

На заводзе не ведалі, як рабіць трактар. Параілі з'ездзіць да Пятра Петрашкевіча. Падаўся ў Вілейскі раён. Знайшоў Пятра ў полі. Напрасіўся за штурвал, аб'ехаў два кругі.

– Атрымліваецца? – спыталі на заводзе.

– Нармальна! – адказаў.

Гэта была ўдача, што не трэба новыя чарцяжы, проста зрабіць другі трактар з такім жа кіраваннем. Ён чакаў гэты трактар з дня на дзень. А яго не было. Высветлілася, праз тыя фонды. Пачалася бюракратычная перапіска. Давялося падключыць абком камсамола, Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ, пакуль, нарэшце, не празвінеў такі просты і такі жаданы званок:

– 17 лютага прыязджайце за трактарам!

...Кава ў кубках стыне. Генадзь, узяўшы на рукі дачку Святланку, якой 8 сакавіка споўніўся год, дзеліцца ўражаннямі, працягвае свой расказ.

– Уладзілі ўсё. Знялі з фонду другога раёна. Паказваюць мне трактар. Пытаюцца: «Выедзеш сам з прахадной?» А я – расхваляваўся. Людзей столькі сабралася. І тэлебачанне яшчэ. Хацеў папрасіць каго. А потым – не! Раз прыехаў за ім, значыць, мой! Я і паеду на ім! Нармальна выруліў. Разварот на пляцоўцы адразу не атрымаўся, не хапіла месца. Даў крыху ўзад, і потым

развярнуўся!

Я гляджу на самаробную секцыю мэблі на ўсю сцяну. Зроблена з мастацкім густам. Цікаўлюся, дзе знайшлі майстра. А Наташаківае, што майстар – побач. Яе Генадзь. Два месяцы павазіўся з гэтай секцыяй, але змайстраваў.

На паліцах шмат кніжак. Асобна – падручнікі.

– Наташыны?

– Ды не. Гена вось паступіў у сельгасінстытут у Вялікія Лукі. На інжынера хоча вывучыцца, – кажа яна.

Вечарам да позняга сядзіць кад кантрольнымі. Дзве зрабіў, а яшчэ – каля дзесятка. Пакой адзін. Тут і малое, і тэлевізар. Адчуваю, несалодка даводзіцца. Яму б кватэру лепшую...

– Асобны дом добра было б, – уздыхае Генадзь. – Бацькі хварэюць моцна. Забраў бы да сябе. Не атрымліваецца з кватэрай, перавязу ў горад бацькаву хату! Трактар ёсць! Чаго цяпер?..

Дапіваем каву.

Садзімся на трактар і павольна, але ўпэўнена, кранаемся з месца. На вуліцы трактар набірае разгон. Едзем у «Сельгасхімію», дзе Генадзь цяпер працуе. У кабіне ўтульна. Рычагі паслухмяныя яго рукам.

– Добрая машына, – кажа Генадзь. – Але пагляджу яшчэ. Газ пастараюся перарабіць на нажны. А потым і яшчэ што папраўлю. Нам з ёй доўга працаваць!

**У. Сауліч**

**На здымку:** Генадзь Броўка ля свайго трактара.

**Фота В. Кажамячонка**